Для бяспечнай камунікацыі ў Telegram зрабіце захады бяспекі.

Простыя захады — трэба выканаць абавязкова.

Паглыбленыя захады — пажадана.

Максімальна клапаціцеся пра сваю ананімнасць у сеціве. Выкарыстоўваючы нават простыя захады, вы здолееце значна павысіць узровень бяспекі.

Простыя захады:

1. Хаваем нумар тэлефона

Налады - Прыватнасць і бяспека - Хто можа бачыць мой нумар тэлефона? = Ніхто

**Ваш нумар тэлефона не будзе бачны нікому.*

2. Прыбіраем асабістыя фота

Налады - Прыватнасць і бяспека - Аватар = Мае кантакты

**Можна пакінуць пункт "Мае кантакты", але важна выдаліць фатаграфіі з вашым тварам з аватаркі.*

3. Перасылка паведамленняў

Налады - Прыватнасць і бяспека - Перасланыя паведамленні = Мае кантакты

**З такімі наладамі пры націсканні на ваш нік ваш юзернэйм будуць бачыць толькі вашы кантакты.*

4. Двухэтапная праверка

Налады - Прыватнасць і бяспека - Двухэтапная праверка

**Вы атрымаеце апавяшчэнне пры спробе ўзлому вашага акаўнта. Не стапрацэнтная абарона, але ўсё ж.*

5. Групы

Налады - Прыватнасць і бяспека - Запрашэнні = Мае кантакты

**Толькі ў вашых кантактаў будзе магчымасць дадаваць вас у групы.*

6. Званкі

Налады - Прыватнасць і бяспека - Выклікі = Ніхто або Мае кантакты

**Гэтая налада неабходная, калі вы не хочаце, каб вам тэлефанавалі з дапамогай Telegram.*

7. Перадпрагляд спасылак

Налады - Прыватнасць і бяспека - Налада даных - Перадпрагляд спасылак

**Спасылкі не будуць загружацца, пакуль вы на іх не націснеце.*

8. Актыўныя сеансы

Налады - Прылады - Актыўныя сеансы

**Гэты пункт меню паказвае, на якіх яшчэ прыладах зроблены ўваход у ваш Telegram-акаўнт. Калі вам яны незнаёмыя, тэрмінова націскайце "Скончыць сеанс".*

9. Геалакацыя

Кантакты - Шукаць людзей паблізу - Забараніць

**Гэты пункт забараняе выяўляць вас па геалакацыі.*

Паглыбленыя захады:

1. VPN. Гэта бяспечнае, зашыфраванае злучэнне, больш падрабязней тут.

Артыкул "11 найлепшых бясплатных VPN-сэрвісаў".

Адрозненні ў выкарыстанні платных і бясплатных VPN тут.

Найбольш папулярныя прапановы VPN-сэрвісаў з кароткім апісаннем у артыкуле.

2. Пароль. Выкарыстоўвайце надзейныя, складаныя паролі – прыклады.

3. Пераход па спасылках. Ажыццяўляйце толькі пры дапамозе ўключанага VPN (гл. п.1) або пры дапамозе браўзера TOR.

4. Тэлефон (для адміністратараў). Адміністраванне паблікаў лепш ажыццяўляць пры дапамозе віртуальных нумароў ці замежных сім-карт. Усе аплаты рабіць пры дапамозе крыптавалюты. Не ўстаўляйце замежную сім-карту ў тэлефон, прададзены ў Беларусі. Пры актывацыі ваш EMEI звяжуць з нумарам тэлефона.

Калі па якім-небудзь з пунктаў у вас узнікнуць пытанні, звяртайцеся да куратара вашай групы на платформе "Нацыя Лідараў".